# Мастак з яе карціны піша...

**Надзея ПАРЧУК**



## *Беларусачка*

Загавары мяне, красуня-беларусачка,
Пявучай, звонкай моваю сваёй,
Няхай яна маю натоліць душачку –
Чароўнай сілай, дзіўнаю красой!

Я перайму, запомню слоўкі гожыя
І ўжо нідзе да скону не згублю,
І не прадам за золата ці грошы я –
Багацце слоў са звону-крышталю...

Табе яны матуляю падораны,
Іх прашчур наш па зернейку збіраў.
Ён быў любові небам удастоены,
Таму пра нас усёй душою дбаў.

## *Мадонна*

Жанчына ў нас не толькі маці,
Але й чароўная княжна,
І гаспадыня ў роднай хаце,
І берагіня, і вясна.

Пакуль яна дзіця калыша –
Занята справаю святой –
Мастак з яе карціны піша,
Паэт складае оды ёй.

Народ заве яе мадоннай,
Што праслаўляецца ў вяках,
І параўноўвае з іконай,
Калі з дзіцяткам на руках.

Мадон сапраўдных ёсць багата
На беларускае зямлі.
Яны, працуючы заўзята,
Старонцы росквіт здабылі.

Жанчыны ў нас паўсюль шчыруюць –
Ім сапраўды ўсё па плячы –
Дзяцей адданымі гадуюць
І вучаць край свой берагчы.